СПЕЦВЫПУСК

РАБОЧЫ!

ШТОТЫДНЁВАЯ МАСАВА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

акция объединенной оппозиции

СУПРАЦЬ ДЫКТАТУРЫ! СУПРАЦЬ ВЫБАРЧАГА ФАРСУ!

14 октября, суббота

15.00 Минск Академия наук



Заснавальнік
і галоўны рэдактар
Віктар ІВАШКЕВІЧ

Адрас рэдакцыі:
220030, г.Мінск,
пл.Свабоды,23,
«РАБОЧЫ»
E-mail: kapp@irex.minsk.by
Тэл. (017)227-04-54
Тэл./факс (017)227-13-16

Пасведчанне
аб рэгістрацыі № 1255
ад 27.12.99г. Наклад 200 000.
Нумар падпісаны ў друк
06.10.2000 г. у 19.00.
Заказ 452
Надрукавана
ў друкарні ПП "Мэджык"
(г.Мінск, вул. Кнорына, 50а)

Наш індэкс
63437

Вчера – Белград. Завтра – Минск

Народ Югославии победил. Демократический кандидат Коштуница объявлен президентом новой Югославии. Армия и милиция перешли на сторону восставших. 5 октября на улицы Белграда вышло 500 тысяч человек. Диктатор Милошевич бежал.

В сердце Европы остался только один осколок диктатуры - режим Лукашенко. В его администрации царит паника. Власти очевидно боятся массовых акций демократических сил. После массового мирного Марша Свободы 1 октября, после акций протеста 8 октября в 20 крупных городах Беларуси в столице проводится акция «Против диктатуры! Против избирательного фарса!»

Югославский сценарий повторится и в Беларуси. Лукашенко неминуемо уйдет. Диктаторам не место в центре свободной Европы!

Жыве Беларусь!

Што трэба рабіць 15 кастрычніка?



Юрый ХАДЫКА, намеснік старшыні грамадскага аб`яднання БНФ "Адраджэньне" і партыі БНФ:

– Вы добра ведаеце, што Лукашенка і яго памагатыя не пагадзіліся ні з адной з 4-х умоў, якія дэмакратычная апазіцыя разам з дэмакратычнай еўрапейскай і сусветнай супольнасцю патрабуюць выканаць. Да гэтай пары няма доступу апазіцыі да дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі, хаця ўсе мы падаткаплацельшчыкі. Не спынены пераслед па палітычных прычынах. Вы ведаеце пастку, якую зрабіў рэжым адносна кампаніі байкота: выбарчым кодэксам ён дазволены, а ў адміністрацыйным яшчэ з савецкіх часоў існуе забарона на агітацыю супраць. Дэмакратычны свет не можа прызнаць такія выбары вольнымі, свабоднымі.



Павел СЕВЯРЫНЕЦ, старшыня грамадскага аб`яднання "Малады фронт":

– Ва ўсім свеце час ад часу адбываюцца ВЫБАРЫ. На іх выбіраюць губернатараў, парламентарыяў і нават прэзідэнтаў.

У нас, у Беларусі, адбываюцца ВЫРАБЫ, і там ВЫРАБляюць уладу, начальнікаў. Столькі, колькі трэба, і такіх, як трэба. Гэта – лагерны загад нам усім: ВЫ – РАБЫ. Гэта – макаронныя ВЫРАБЫ на вушы.

Беларуская моладзь ведае, што гэта – несапраўдныя выбары. Гэта – выбіральня. 1995 год – выбары-95, 1999 год – выбары-99, 2000 год – выбары ў палатку – выбары-00. На гэтыя нулёвыя выбары моладзь не пойдзе.

Не заканчваецца ўсё на плошчы. Не заканчваецца ўсё праз два тыдні. 14 кастрычніка ў 15 гадзін – чарговае шэсце. Збор – ля Акадэміі навук. У пачатку лістапада мы выходзім на шэсце "За перамены". Моладзь не пойдзе на выбары. Моладзь патрабуе пераменаў. Свабоду слова, свабоду сумлення, свабоду выбару, усю свабоду, якая дадзена кожнаму ад нараджэння Госпадам Богам, мы не аддамо нікому: ні рэжыму, ні імперыі.



Станіслаў ШУШКЕВІЧ, старшыня партыі "Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада":

– Нельга ўдзельнічаць у гэтых выбарах таму, што мы нікога не выбіраем. Выбіраюцца цюцькі для так званай палаты, якая не мае ніякай улады. Прааналізуйце Канстытуцыю-96 і пераканайцеся самі: якія б законы ні прымаліся цэлым парламентам, адзін чалавек можа перакрэсліць любы з іх і выдаць свой дэкрэт, якога будуць прытрымлівацца ўсе тыя, хто ведае, што пры нармальнай уладзе яны б ніякай улады не мелі. Мы не павінны ісці па гэтаму шляху. Мы не можам удзельнічаць у гэтым фарсе, таму што нашыя сябры сядзяць у турмах, нашыя людзі знікаюць.

Выбары – гэта калі кожны чалавек можа аб'явіць, што і чаго ён хоча. А у нас толькі адзін чалавек з вусамі можа гаварыць, што ён самы разумны і пры гэтым хлусіць, хлусіць, хлусіць. Ён, дарэчы, сказаў, што я атрымаў мільярд даляраў за тое, што падпісаў Белавежскія пагадненні. Дык навошта мне было красці тыя цвікі, пра якія ён год гаварыў?



Людміла ГРАЗНОВА, дэпутат Вярхоўнага Савета:

– Я простая беларуская жанчына, якая вырасла на гэтай зямлі. Хочацца, каб мы сталі грамадзянамі, каб адчулі адказнасць за свой лёс, за будучыню сваіх дзяцей, сваю краіну. Пакуль кожная жанчына, кожная маці, кожны бацька гэтага не зробяць, мы сябе не абаронім. Паглядзіце на нашых суседзяў сербаў: сотні тысяч стаяць за сваю краіну, за свабоду.

Калі вы пойдзеце на выбары – гэта гарантыя, што Лукашэнка застаецца яшчэ на 5 год пры ўладзе. Вы вытрымаеце гэта?

Калі вы пойдзеце на выбары, гэты парламент будзе выбраны і Еўропа яго вымушана будзе прызнаць. А праз месяц Лукашэнка падпіша Саюзную дамову, парламент яго ратыфіцыруе, і ва ўсіх у нас з'явіцца новая радзіма – Расія. Знаю, што шмат у каго там сваякі, сябры... Мы будзем ім спачуваць, дапамагаць, трымаць. Але не трэба туды ісці. Як не трэба зараз ісці на выбары. Пойдзем усе разам праз год на прэзідэнцкія выбары за аднаго нашага дэмакратычнага кандыдата.



Вінцук ВЯЧОРКА, старшыня грамадскага аб'яднання БНФ "Адраджэньне" і партыі БНФ:

– Тое, што мы сёння сабраліся разам – гэта выкарыстанне магчымасці ў варунках поўнай інфармацыйнай блакады параіцца, што нам рабіць не толькі ў бліжэйшыя два тыдні, а і ў наступныя паўтары гады.

Па-першае, не палянуемся, патэлефануем і растлумачым сваім сябрам і сваякам, чаму нельга ісці на выбарчы фарс.

Па-другое, у кожнага з нас ёсць родныя ў абласцях і раёнах, райцэнтрах і вёсках. Туды не даходзіць незалежная прэса. Там людзі не ведаюць, што можна паслухаць радыё "Свабода" ці радыё "Рацыя". Прыедзьма да іх, растлумачма сувязь паміж выбарамі і перспектывай: мы сваімі рукамі можам падпісаць прысуд незалежнасці нашай краіны.

Мы скарыстаем гэтыя 2 тыдні, што засталіся да 15, каб сабраць подпісы пад 4 умовамі дэмакратычных выбараў, бо мы думаем пра наступны год – пра прэзідэнцкія выбары.

Вельмі добра, што сёння мы правялі Марш Свабоды бездакорна, і ва ўладаў няма да нас прэтэнзій. Мы выглядалі годна і паеўрапейскі. Гэта значыць, што 8 кастрычніка ў 23 гарадах Беларусі адбудуцца свае Маршы Свабоды. І мы, аб'яднаная дэмакратычная апазіцыя, паедзем у гэтыя гарады, каб сказаць словы праўды тым людзям, якія доўга былі адрэзаны ад яе, якія доўга перадольвалі страхі.



Анатоль ЛЯБЕДЗЬКА, старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі:

– Перамога прыходзіць да тых, хто яе жадае. Перамога прыходзіць да тых, хто працуе штодзённа. Нельга вось проста так сабраць 100 000 чалавек і завесці на плошчу Незалежнасці. Таму мы звяртаемся да тых, хто не з'яўляецца сябрамі дэмакратычных партый: нам неабходна так адпрацаваць гэты год, каб паўтарылася сённяшняя югаслаўская сітуацыя.

Наша мэта – перамога на прэзідэнцкіх выбарах. Мы павінны:

1. Стварыць адзіны дэмакратычны рух і сабраць пад сцягам дэмакратыі ўсіх, хто жадае перамен.
2. Выпрацаваць працэдуру, дзякуючы якой мы вылучым адзінага кандыдата ад дэмакратычных сіл.
3. Стварыць агульнабеларускую сістэму распаўсюджвання інфармацыі.
4. Стварыць агульнабеларускую сістэму наглядання і кантроля.

Наша мэта – прэзідэнцкія выбары. І мы іх абавязкова выйграем, бо сёння Лукашэнка – гэта лідэр паслухмянай меньшасці. Толькі 13% людзей сёння падтрымліваюць Лукашэнку. 36% – нашы прыхільнікі. 50% – не ведаюць, каго падтрымліваць: нас ці іх. Каб знайсці да іх шлях, нам патрэбна дапамога. Я звяртаюся да тых, хто сёння не з'яўляецца сябрам аніякай партыі, але жадае ўдзельнічаць у працы. Праяўляйце ініцыятыву: хто можа быць наглядальнікам, наглядайце, хто можа быць распаўсюджвальнікам інфармацыі, распаўсюджвайце. Толькі калі мы бу-дзем працаваць агульна, зможам перамагчы. Прагназую, што праз год 500 тысяч будзе стаяць на плошчы Незалежнасці і мы будзем святкаваць нашу перамогу.

Знайсці нас можна па тэлефонах:
БНФ – (017) 284-50-12,
ОГП – (017) 211-02-79.


Соотношение времени, выделенного Лукашенко, правительству, пропрезидентским партиям, их лидерам и оппозиционным партиям, движениям, их лидерам в "Панараме" в августе 2000 года (100% = 8 ч. 27 мин. 50 сек.)

***Статья 33.** Каждому гарантируется свобода мнений, убеждений и их свободное выражение.*

Никто не может быть принужден к выражению своих убеждений или отказу от них.

Монополизация средств массовой информации государством, общественными объединениями или отдельными гражданами, а также цензура не допускаются.

(Из Конституции Республики Беларусь 1994 года с изменениями и дополнениями, принятыми на республиканском референдуме 24 ноября 1996 года.)



Источник: Центр «Свобода слова в поддержку демократии»



На 15 октября назначены выборы в "лукашенковский парламент" — Палату представителей. Уже сегодня известно, что они не будут признаны международной общественностью, поскольку беларусские власти отказываются выполнить требования Организации по безопасности и сотрудничеству в Европе. Речь идет о простых и понятных вещах: расширении полномочий парламента, выпуске из тюрем политзаключенных, участии политических партий в работе избирательных комиссий, возможности оппозиции излагать свою точку зрения на телевидении и в других государственных СМИ.

Поскольку невыполнение этих требований делает участие в выборах бессмысленным, ряд оппозиционных партий принял решение об их бойкоте. Оно вызвано не страхом проигрыша, а сознательным нежеланием участвовать в нечистых играх, которые нужны Лукашенко, но не стране. Тактика бойкота предполагает ряд акций: "Народный референдум" (сбор подписей под требованием изменить условия выборов), уличные выступления, проведение международных встреч и семинаров с разъяснением беларусской ситуации и др.

Координационная рада демократических сил призывает поддержать бойкот выборов всех, кому не нравится курс нынешнего руководства страны.

Мы, грамадзяне Рэспублікі Беларусь, лічым, што свабодныя і справядлівыя выбары – гэта шлях да дабрабыту і росквіту. Такія выбары – мясцовыя, парламенцкія, прэзідэнцкія, могуць адбыцца толькі пры выкананні ўмоў, падтрыманых АБСЕ – Арганізацыяй па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе:

1. *Спыненне пераследу людзей па палітычных матывах, вызваленне палітычных вязняў, высвятленне лёсу знікнуўшых людзей, гарантыя свабоды шэсцяў і мітынгаў.*
2. *Ніхто, акрамя парламента, не можа прымаць законы, абавязковыя для выканання ўсімі, і ажыццяўляць кантроль за выкананнем дзяржаўнага бюджэту.*
3. *Палітычныя партыі і грамадскія рухі павінны мець гарантаваны бесцэнзурны доступ да дзяржаўных радыё і тэлебачання.*
4. *Выбарчыя камісіі павінны быць незалежнымі ад улады і складацца з прадстаўнікоў палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў.*

Прозвішча	Імя, Імя па бацьку	Год нарадж.	Месца жыхарства *(вобласць, горад, вуліца, дом, кватэра)*	Подпіс